**В. І. Басько**

# Святочна-абрадавыя традыцыі: механізмы ўзнаўлення, захавання і трансляцыі

*Артыкул прысвячаецца праблеме сучаснага стану каляндарных свят і абрадаў як аб′ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, іх аховы, засваення і адаптацыі ў сучасным сацыяльна-культурным асяроддзі.*

*Как бы ни понималась роль тысячелетнего культурного наследия в нашей действительности, как бы ни оценивалось прошлое перед лицом настоящего, остается бесспорным, что «новизна» наших дней не может утвердиться без обращения к старине.*

*Н. И. Толстой*

Сучасныя каляндарныя абрады не рэгулююць жыццё чалавека, як старадаўнія, дзе рэлігія мадэліравала межы сакральнага і магічнага ў яго жыцці. Сёння чалавек у жыцці сваім кіруецца рацыянальна-лагічнымі ведамі, а рэлігійная культура аказваецца адной са сфер, з якой ён найбольш арганічна суадносіцца. На сучасным этапе пад'ём хрысціянскай рэлігійнай свядомасці грамадства (пачатак 1990-х гг.) і народная традыцыя разглядаюцца ў адзіным кантэксце, як цэласны феномен.

Абрадавы каляндар — адна з частак фальклорнай традыцыйнай культуры існуе не ізалявана, а ў перапляценні з іншымі міфалагічнымі ўяўленнямі і вобразамі аб сусвеце. «У аснове асэнсавання лакальнай (рэгіянальнай) культуры ляжыць уяўленне пра культуру як адзінства свету чалавека і свету соцыуму, па сутнасці, апрадмечанага гістарычнага вопыту чалавецтва».[1] Б. Пуцілаў, рускі вучоны культуролаг і фалькларыст, адзін з заснавальнікаў тэорыі рэгіянальна-лакальнага пачатку ў фальклоры адзначае: «Фольклорная традиционная культура в своем конкретном наполнении всегда региональна и локальна. Ее естественная, нормальная жизнь повязана з жизнью определенного, ограниченного теми или иными рамками, коллектива, включена в его деятельность, необходима ему и регулируется характерными для него социально-бытовыми нормами».[2]

Агульнапрызнана, што святочная традыцыйная культура, яе архетып імкліва знікае. Гэта абумоўліваецца сацыяльнымі зменамі, глабалізацыйнымі працэсамі і шэрагам іншых прычын, якія даследчыкамі не раз адзначаліся. Нягледзячы на разбурэнне фальклорнай культуры, што назіраецца ў нашай краіне і ў культурах краін Усходу і Захаду, рытуальна-абрадавыя практыкі святочнага календара беларусаў уяўляюць сабой заказнік беларускай архаічнай культуры. Рэлікты абрадавых дзеянняў, каляндарна-абрадавых песень, звычаяў і інш. у рознай ступені захаванасці (больш у пасіўнай, у памяці) з'яўляюцца часткай сучаснай беларускай культуры. Страцілі сваё бытаванне і засталіся толькі ў памяці старэйшых жыхароў вёсак архаічныя абрады «Жаніцьба Коміна» (Гомельскае Палессе), «Загуканне вясны», «абкатванне» і «абворванне» вёсак на Купалле (Магілёўскае Падняпроўе) і інш. Некаторыя з іх ўзнаўляюцца і прымаюць гульнёва-забаўляльную форму — «Дзед касцёй падавіўся», «Баба сырам падавілася» (Віцебскае Паддзвінне).

Лакальныя асяродкі жывой святочнай традыцыі — абрады каляднага, велікоднага, веснавога комплексаў, Купалля зафіксаваны навукоўцамі ў час экспедыцый (1993—2010) амаль ва ўсіх рэгёнах Беларусі.[3]

Адзін з самых пашыраных святочных абрадаў жывога бытавання — абрад калядавання. Сёння, на Каляды ў вёсках можна сустрэць гурты калядоўшчыкаў, і такая з'ява не здзіўляе, а ўспрымаецца як норма. «Норма» — няпісаны закон, які надае традыцыі жыццяздольнасць. У адрозненні ад абраду калядавання валачобны абрад на стадыі затухання, асяродкі яго актыўнай формы яшчэ маюць месца на Віцебшчыне, Гродзеншчыне, Міншчыне. Лакальна рытуальныя практыкі валачобнікаў захоўваюцца на Магілёўшчыне, Гомельшчыне, Брэстчыне.

Унікальнай з'явай сучаснага жыцця з'яўляецца бытаванне старадаўніх веснавых абрадаў: «Ваджэнне куста» (Брэсцкае Палессе), «Ваджэнне стралы», «Ваджэнне русалкі», «Ваджэнне сулы», «Юр'я» (Гомельскае Палессе, Гродзенскае Панямонне), «Бразгун» (Магілёўскае Падняпроўе).

Некаторым старадаўнім абрадам, якія маюць форму «жывой» традыцыі, нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэ-

[1] *Фалькларыстычныя* даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. / пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. — Мінск : Бестпрынт, 2007. — Вып. 4. Боганева, А., Валодзіна, Т. Варфаламеева, Т., Лабачэўская, В. Канцэптуальныя асновы комплексных фальклорна-этнаграфічных даследаванняў традыцыйных лакальных культур Беларусі (с. 30).

[2] *Путилов, Б. Н.* Фольклор и народная культура / Б. Н. Путилов. — СПб., 2003. — С. 156.

[3] Матэрыялы даследаванняў па каляндарнай абраднасці з архіва аўтара ўвайшлі як частка комплекснага даследавання традыцыйнай культуры рэгёнаў Беларусі, па выніках якога рэалізуецца праект 6-томнай анталогіі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыяльнай спадчыны. Да такіх адносяцца веснавыя абрады — «Юраўскі карагод» в. Пагост Жыткавіцкага раёна і «Ваджэнне і пахаванне стралы» в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці; абрад калядавання — «Шчодрык» в. Рог Салігорскага раёна і «Цары» в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці; «Юр'е» в. Анохава Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці; калядная абрадавая гульня «Цярэшка» г. Лепеля Віцебскай вобласці і інш.

Аўтэнтычныя святы з'яўляюцца залатым фондам культурнай спадчыны беларусаў. Узнаўленне і вяртанне да гэтых жыватворных крыніц узбагаціць скарбніцу святочных традыцый, вызначыць каштоўныя, стваральныя і рэгулятыўныя функцыі сучасных каляндарных свят і абрадаў, а таксама будзе садзейнічаць устанаўленню суадносін традыцыйнай і сучаснай культуры, народнага аматарскага мастацтва, бо менавіта свята ўяўляе сабою своеасаблівы сембіёз вуснай паэзіі і эпасу, музыкі і абрадавай песні, народнага тэатра і народнага танца, гульні, прыкладнога мастацтва і інш.

Не ўсе святочныя звычаі і абрады застаюцца жыццяздольнымі, многія з іх не ўпісваюцца ў лад сучаснага жыцця, у нашу свядомасць па той прычыне, што уклад жыцця, узровень культуры і г. д. карэнным чынам адрозніваюцца ад таго, у якім узнік той ці іншы абрад. Напрыклад, купальскі звычай рытуальнага катання «калёс» (возу). Па тлумачэнні інфарматараў рытуальны абыход здзяйсняўся а поўначы «дзеля таго, каб дзеўкі замуж не ішлі ў другія вёскі» (Хоцімскі раён, Магілёўскай вобласці), або звычай крадзяжу нявест падчас кірмашу на Масленіцу (Шаркаўшчынскі раён Віцебскай вобласці)[4] і інш. Капіраванне і ўзнаўленне падобных звычаяў і абрадаў без асэнсавання суаднясення з сучаснасцю прыводзяць да іх штучнасці, бессэнсоўнасці. Так, некаторыя звычаі і абрады лакальных культур ва ўмовах развіцця грамадства натуральным шляхам знікаюць з побыту, а некаторыя наадварот, увасабляюць новыя рысы сучаснасці і атрымліваюць развіццё. Гэта заканамерны працэс.

На сучасным этапе старадаўнія святы народнага календара, у большасці сваёй, не суадносяцца са сваім родавым прызначэннем, бо ў іх парушана адна з галоўных функцый святочнага абраду — духоўная, вера людзей у дапамогу звышнатуральных сіл, у гонар якіх здаўна і здзяйсняліся. Неабходна адзначыць характэрную рысу сучаснай «жывой» святочнай традыцыі, дзе назіраецца паступовае адміранне першапачатковай, больш даўняй магічнай трактоўкі рытуальна-абрадавых дзеянняў і ўзрастае роля царкоўна-хрысціянскага светапогляду. Напрыклад, персанажы «каза», «мядзведзь, «жораў» і інш., у абрадзе калядоўшчыкаў найбольш усведамляюцца маладым пакаленнем як гульнёва-забаўляльныя, і наадварот, як рэлігійны сімвал успрымаюцца віншаванні з каляднай «зоркай».

Язычніцкія вераванні ніколі не прымаліся хрысціянствам і хрысціянскія ў пэўны перыяд (больш як паўвека) таксама забараняліся, але рэшткі старадаўніх абрадаў захаваліся ў аўтэнтычнай форме да нашых дзён як асобая форма культуры. Некаторыя сучасныя хрысціянскія святы, напрыклад, хрысціянскія абрады Раства Хрыстова і калядная народная традыцыя суіснуюць ў побыце як адзіны цэласны комплекс.

Святочныя традыцыі не застаюцца нязменнымі, яны трансфармуюцца і відазмененыя актуалізуюцца, асімілююцца ва ўмовах соцыуму, развіваюцца за кошт знешніх з'яў, якія адбываюцца ў грамадстве, і ў той жа час заўсёды захоўваюць свой генетычна значны для жыццяздольнасці код. Пры ўсіх міжнацыянальных зносінах і ўзаемадзеяннях ахова няпісаных норм традыцый, устаяўшыхся канонаў — натуральная інстынктыўная акцыя самазахавання, калі ў падсвядомасці людзей захавалася натуральная неабходнасць трымацца звычаю і выконваць святочныя абрады і рытуалы. Калі людзі розных нацыянальных культур, веравызнанняў ці розных мясцовых традыцый жывуць побач увесь час, тэрміновая з'ява эмацыянальна-духоўнага адчування пераходзіць у практычна-бытавую, што тычыцца свят — у абрадава-сюжэтную структуру. Прыўнесеныя элементы святочных абрадаў іншых традыцый з цягам часу яднаюцца з мясцовымі, раствараюцца ў іх, ці наадварот — некаторыя элементы дамініруюць (карагодная традыцыя ў калядным комплексе на Віцебшчыне, прыўнесеная стараабрадцамі), і ў выніку атрымліваецца нешта новае. Падобная змешанасць святочных абрадавых элементаў садзейнічае ў некаторай ступені не толькі трансфармацыі самаго абраду, а надае яму своеасаблівы духоўны і мастацкі каларыт. Відавочна, жыццё само карэкціруе традыцыю, за кошт гэтага яна развіваецца, альбо страчвае некаторыя абрадавыя элементы.

Само паняцце «аднаўленне» (узнаўленне) прадугледжвае два асноўныя моманты: рэстаўрацыю і рэканструяванне, як бы дзеліцца на два асноўныя падыходы засваення фальклорнага матэрыялу.

Рэстаўрацыя святочнай традыцыі, імкненне ўзнавіць яе ў першапачатковым выглядзе магчы-

[4] Матэрыялы экспедыцыйных запісаў з архіва аўтара (Магілёўская вобл. — 1994 г., Віцебская вобл. — 1999 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ма толькі з удзелам саміх носьбітаў, дзякуючы захаванню яе ў памяці. У такім выпадку выкарыстоўваецца метад навучання і пераймання традыцыі ў вуснай форме больш маладым пакаленнем. Рэканструяванне традыцыі ў працэсе аднаўлення ажыццяўляецца па апісаных даследчыкамі матэрыялах, расказах, зафіксаваных запісах, захаваўшыхся рэштках асобных абрадавых элементаў, іх сімволікі і інш. Часта пры аднаўленні свят адначасова выкарыстоўваюцца і метад рэстаўрацыі і рэканструяванне.

Працэс узнаўлення святочна-абрадавых традыцый, іх засваенне і адаптацыя ў сучасным сацыяльна-культурным асяроддзі — працэс доўгатэрміновы, які патрабуе фарміравання духоўнай самасвядомасці людзей, бо дамінантнай асновай іх існавання з'яўляецца вераванне, рэлігійны фактар, які пад уплывам сацыяльных змен і забарон быў страчаны і амаль не перадаваўся некалькім пакаленням. Сучасныя святы народнага календара маюць хрысціянізаваны характар, які падтрымліваецца і паступова засвойваецца моладдзю, але святочныя звычаі, рытуальна-абрадавыя практыкі, якія за стагоддзі былі сфарміраваны ў народзе для большасці людзей сярэдняга ўзросту і моладзі, амаль невядомыя. Выяўленне, вывучэнне і трансляцыя лакальнай традыцыі ў соцыуме, выпрацоўка механізмаў яе ўзнаўлення і захавання патрабуе комплекснага падыходу і ўзаемадзеяння кіраўнікоў і спецыялістаў сферы культуры, метадычных служб рэгіёнаў і рэспубліканскіх цэнтраў навукі і культуры. Пры выяўленні і вывучэнні такой традыцыі неабходна ўлічваць лакальную культуру ў цэлым: прыродны ландшафт і яго арэалы павышанай значнасці (возера, лес, балота, свяшчэнныя месцы, камяні і г. д.), фальклорнае светаўспрыманне (міфы, легенды, паданні, былічкі і інш.), семантычныя і структурныя асаблівасці ў бытавых і абрадавых паводзінах (сэнсавая і функцыянальная трактоўка абраду, слова, прадмета і інш.), культавыя пабудовы, паселішчы і звязаныя з імі ўяўленні і інш.

Захаванне святочнай традыцыі патрабуе прамых сувязей яе носьбітаў і наяўнасці моладзі і падлеткаў для яе пераемнасці. Фальклорныя традыцыі захоўваюцца і ўзнаўляюцца, калі гэта спадчына не адарвана ад механізма наследавання. Доўгатэрміновы працэс міграцыі сельскай моладзі ў горад абумовіў самаразбурэнне вясковага соцыуму, імклівае знікненне (адміранне) вёсак, а разам з тым страту ўнікальных асяродкаў фальклорнай традыцыйнай культуры. Спыніць такі працэс, зберагчы вёску, яе інфраструктуру, забяспечыць эканамічнае і культурнае развіццё сельскай гаспадаркі — ключавыя задачы сённяшняй дзяржаўнай палітыкі.

Рэструктураванне сельскіх населеных пунктаў і стварэнне аграгарадкоў, іх інфраструктуры, з'явілася істотным фактарам прытоку жыхароў у цэнтральныя сядзібы з іншых вёсак і гарадоў. Новастворанargumentы соцыум патрабуе правядзення сацыялагічных даследаванняў па дэмаграфічным складзе насельніцтва, яго веравызнанні, што паслужыць асновай для вывучэння як лакальнай (мясцовай) традыцыі, так і звычаяў, абрадаў жыхароў іншых вёсак і рэгіёнаў. Вынікі падобнай даследчай работы падкажуць шляхі і механізмы забеспячэння жыццяздольнасці і развіцця фальклорных традыцый падобных цэнтральных сядзіб.

На перспектыву, аграгарадкі, як цэнтральныя сядзібы, могуць стаць культурнымі цэнтрамі, аб'ектамі сельскага аграэкатурызму з развітай інфраструктурай сельскага культурнага турызму на аснове выкарыстання мясцовых традыцый, звычаяў і абрадаў. І тут асаблівую вастрыню набывае праблема захавання традыцыйных форм лакальных культур у іх максімальна поўным і цэласным выглядзе. Неабходна падтрымліваць і ахоўваць, як запаведнікі, асяроддзе стыхійнага, жывога бытавання святочнай традыцыі, якая мае аўтэнтычную форму, арганізоўваць разнастайныя формы яе пераемнасці; выяўляць больш актыўных носьбітаў аўтэнтычных традыцый, налажваць з імі пастаянныя кантакты, клапаціцца аб іх фізічным стане і падтрымліваць маральна; далучаць да аўтэнтычных абрадавых свят дзяцей і моладзь з мэтай пераймання ў вуснай форме гэтай крыніцы народнай культуры.

Захаванне лакальных культур, і адной з галоўных яе частак — святочнай каляндарнай традыцыі, у многім будзе залежыць ад прафесійнага ўзроўню і кваліфікацыі спецыялістаў-практыкаў устаноў культуры сяла, раённых і абласных метадычных цэнтраў, іх ведаў і падыходаў да вывучэння і ўліку мясцовых лакальных асаблівасцей святочных абрадаў, звычаяў і г. д.

## Summary

*The article is dedicated to the problem of the modern condition of calendar holidays and rites as objects of non-material cultural heritage of Belarus. Special attention is paid to the protection and adaptation of these objects in modern socio-cultural environment.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ